Ганчарова-Цынкевіч Т.У., Мельнікава Т.М., горад Мінск

**Фальклорна-песенныя матывы паэзіі Максіма Танка**

Творчасць Максіма Танка цесна звязана з фальклорам. Ён вучыўся ў беларускага народа ствараню тыповых вобразаў і характараў, высокаму паэтычна-эстэтычнаму майстэрству ў паказе рэчаіснасці. Як мастак паэт ніколі не парываў з народна-песеннай творчасцю, падтрымліваючы з ёй сувязь на працягу ўсяго свайго жыцця.

Да фальклорнай песні М.Танк звярнуўся рана, яшчэ ў пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя ў Заходняй Беларусі. Свае творы ён называў песнямі (“Песня”, “Эх вы, песні…”, “Тры песні”, “Песня кулікоў”, “Хто пачуў тваю песню жалезную” і інш.), падкрэсліваючы іх блізкасць да вуснай народнай творчасці: Эх вы, песні, мае песні // З ніў, з дубоў цяністых, // Ад сярпа, касы, сякеры, // Ад крыніц бруістых! // Не пісаў бы, не складаў бы // Я вас, думы-песні, // Каб не вецер шызакрылы, // Вецер напрадвесці… [1, с. 39]

Працягваючы векавую беларускую традыцыю, паэт акцэнтуе ўвагу на непаўторную сувязь з нацыянальнай песеннай гісторыяй і ў той жа час падкрэслівае складанасці класавага і сацыяльнага змагання працоўных Заходняй Беларусі: Каб не тыя маладыя // Дні ў мурах астрожных // І напевы векавыя // Сосен прыдарожных, // Не знайду спакою з вамі, // Песні гневу, болю… [1, с. 39] Радкі гэтага верша паступова ператвараюцца ў гераічную песню, якая прапушчана праз душу і сэрца аўтара, і схавана ў глыбокай музыцы твора.

У фальклорнай лірыцы ўсе з’явы чалавечага жыцця вымяраюцца і ацэньваюцца прыроднай меркай, усе вобразы і асацыяцыі псіхалагічна матываваныя адносна эстэтычным уяўленням народа. Так, у вершы “Зара на плоце іскрамі затлела…” лірычны герой звяртаецца да зязюлі, да якой звычайна звяртаюцца героі многіх вусна-паэтычных твораў: Стаю я і гляджу на маю вёску, // Прачнуліся вясеннія сады, // Зязюля на лістах рабой бярозкі… // Скажы мне, варажбітка баравая, // Мо чула дзе, ці сможа, знаеш ты: // Калі да нас свабода завітае, // Калі з астрогаў вернуцца браты? // І звонка мне яна закукавала // У цішы празрыстай, веснавой… [1, с. 50]

У беларускай народнай паэтыцы вобраз птушак займае першае месца па частаце ўжывання.

Выяўленне пачуццяў і думак лірычнага героя фальклорнай песні заўсёды разгортваецца на фоне паэтычнага хараства роднай прыроды, якая малюецца, як правіла, штрыхамі і дэталямі на дзіва дакладнымі і выверанымі. Нешта падобнае назіраем у творчасці М.Танка. Чытаем: “Зара на плоце іскрамі затлела, // Клубіцца пыл прасёлачных дарог, // А на страсе чубатай, пачарнелай // Буслінае гняздо і сіні мох… - і бачыш яркую яркую

веснавую раніцу на Мядзельшчыне (радзіма аўтара), традыцыйную карціну быту беларускай вёскі.

Моцная знітаванасць паэзіі М.Танка з фальклорна-песенным мастацтвам назіраецца ў вершы “Хто пачуў тваю песню жалезную”: Хто пачуў тваю песню жалезную, // Хто астрожную скаргу пачуў? // Беларусь, твае далі бязмежныя // Ускалыхнуць сваёй песняй хачу! [1, с. 47]

Прыгожая песня-мара ўражвае сваім натуральным прыродным хараством, якое тоіцца ў сіле пачуцця і глыбіні думкі паэта. Як і творы фальклорных жанраў, гэты верш напоўнены магічнымі чарамі эмацыянальнага ўздзеяння, высакародным чалавечым зместам, дасканаласцю лірычнага гучання.

У народнай традыцыі пабудаваны творы “Развітанне”, “Пасылае маці думы”, “На шырокім шляху”, “Казак гнаў каня”, “У Брэсце”, якія ўключаюць сябе вусна-паэтычныя вобразы і сімвалы (яснае сонца, ляжаць асілкі, пры зорах ночы, у даліне шырокай і інш).

Адлюстроўваючы гераізм свайго народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, М.Танк карыстаецца фальклорнымі матывамі, яркім прыкладам з’яўляецца верш “Казак гнаў каня”, дзе смерць лірычнага героя падобная да трагедыі са шматлікіх народных твораў пра пагібель адважнага хлопца-воіна ў барацьбе са злом. Аўтар выкарыстоўвае такі пашыраны сродак паэтычна-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці ў народным фальклоры як сталы эпітат: гадзіна ліхая, куля злая, сіні Дон, востры клінок, палын адзінокі. Такія эпітаты традыцыйныя для вуснай народнай творчасці і на працягу стагоддзяў як гатовыя мастацкія формы пераходзяць з песні ў песню, не абнаўляючы свайго вобразна-сэнсавага значэння.

Даволі часта ў беларускіх народных песнях сустракаецца эпітат у форме прыдатка. У творы М.Танка чытаем: І воран-крумкач // Не смеў казака // Будзіць у даліне шырокай… [1, с. 172] Адчуваючы самабытнасць народнай моватворчасці паэт даволі часта ўжывае падобныя двайныя эпітаты – цікавую і спецыфічную фальклорную з’яву, як непераўзыдзены ўзор дакладнасці і ёмістасці вобразнасці слова.

У адпаведнасці з народна-паэтычнай творчасцю М.Танк апявае неўміручасць загінуўшых у час вайны. Так, у вершы “Гэта было вясной” малюецца вобраз маладой вярбы, якая вырасла “на свежых траншэях, курганах”, як сімвал славы і памяці аб героях: І я зразумеў: яна // Прыйшла з далёкага свету, // Скуль нехта хоча да нас // Вярнуцца вясеннім цветам… [1, с. 232-233]

Паэт часта ў фальклорныя вобразы ўкладваў новы змест. У вершы “Плакучая вярба” ў аднайменныя песенным вобразе-сімвале ён увасабляе смутак і тугу мацярынскага сэрца, жалобу маці, у якой сын загінуў на вайне. Нават і тады, калі яна ператварылася ў дрэва не вызваліла ад пакут:

Але ўсё роўна сум не пакінуў. // Шумяць і плачуць вярбы галіны // Парой асенняй, парой дажджлівай. [1, с. 381]

Наватарства аўтара ў творчым пераасэнсаванні фальклорных традыцый. Паэтычнасць дасягаецца ў лірыцы М.Танка ўнутранай змястоўнасцю, ідэяй і эмацыянальнай насычанасцю радка. Думкі паэта шчодра афарбаваны пачуццямі, а пачуццё ўбірае ў сябе думку. Як мастак ён з фальклорам падтрымліваў сувязь на самым высокім узроўні эстэтычнай культуры. Эмацыянальны і інтэлектуальны пачаткі – неад'емная традыцыя вуснай народнай творчасці, паказчык у паэзіі М.Танка высокага ўзроўню маральна-этычнай свядомасці.

Для многіх сваіх вершаў паэт чэрпаў фарбы і вобразы з песеннай культуры беларусаў. Да такіх можна аднесці "Лён", "Песня трактарыста", "Там, дзе вішанька", "На дажынках", "Заручаны", "Застольная", "Вяселле" і інш. Некаторыя з іх маюць не толькі песенную форму, але і гучаць як творы народнага складу. Паэт ярка і запамінальна апісвае народныя звычаі і традыцыі, нанава пераасэнсоўвае прымаўкі і прыказкі.

У творчасці М.Танка шырока прадстаўлена любоўная лірыка. Так, вершы аб каханні " У вясенні дзень", "У садочку май", "Рэчанька", "Калі мяне любіш", "Плача хмара без жалю", "Не сячы сасны", "Анэтка", "Завушніцы", якія складзены ў форме народных песень, маюць шмат адметнасці, гумару, жартоўнасці. У іх услаўляецца жыццё, маладосць, жаночая прыгажосць як вялікая ўладарная сіла ў свеце.

Так, у "Завушніцах" паказана нараджэнне сапраўднага кахання, сціплае прызнанне хлопца-беларуса, узмоцненае замовай: І каб свайго дабіцца, // Прасіў я шчыра майстра // Зрабіць ёй завушніцы. // На гэтых завушніцах // Я напісаў закляцце - // Усё, што не сказаў ёй, // А ў чым хацеў прызнацца. [1, с.140] Па-свайму гучанню верш блізкі да творчасці народа і ўспрымаеццца як апафеоз пачуцця, якое нельга стрымаць.

М.Танк валодае прыёмам уключэння песенных матываў у канву сваіх вершаў. Аб гэтым сведчаць такія творы як "Рэчанька", "З тых дзён", "У полі вярба" і інш.

Часам мастак слова звяртаецца да песень іншых народаў. Напрыклад, па матывах славацкай песні напісаны яго верш "Песня Яностка", а верш "Каламыйка" створаны па ўзору ўкраінскіх народных каламыек.

У творчасці таленавітага паэта народна-песенны матэрыял атрымлівае заўсёды арыгінальную трактоўку, умелае падпарадкаванне ідэйнай задуме.

У яго лірыцы ёсць шмат твораў, якія цалкам заснаваны на фальклорным матэрыяле: казках, легендах, паданнях, байках.

Творы "Сказ пра Вяля", "Казка пра Музыку", "Журавель і Чапля", "Галінка і верабей", "Конь і леў", "Ля вогнішч начлежных", "Іван-ды-мар'я" з'яўляюцца паэтычнымі апрацоўкамі займальных казачных сюжэтаў і адрасаваны дзецям. У гэтых казках героямі выступаюць

жывёлы, расліны, птушкі, аўтар вобразна апавядае аб цудадзейным свеце прыроды, вучыць маленькіх чытачоў выхоўваць у сабе такія чалавечыя якасці як сумленнасць, справядлівасць, шчырасць і працавітасць.

У казцы “Ля вогнішч начлежных” пісьменнік выступае абаронцам духоўных ідэалаў свайго народа, спрабуе вырашыць адвечную праблему: ці можна за грошы купіць каханне? Сюжэт тыповы для многіх фальклорных песень.

Рамантычнымі вобразамі Галіны і Васілька твора “Ля вогнішч начлежных” аўтар паэтызуе сілу кахання і духоўную прыгажосць беларусаў.

Пісьменнік ідэалізуе галоўную гераіню, якая не здрадзіла свайму каханню ні за якія грошы: “Я вольнаю птушкаю вырасла тут… // І нас не разлучаць ні годы пакут, // …Ні грозная сіла”. [1, с. 38] Шчырасць пачуцця дзяўчыны, адданасць і вернасць у каханні ўзняты ў казцы, як і ў вусна-паэтычнай творчасці, на самую высокую ступень агульначалавечай маралі, якая будзе заставацца для многіх і многіх пакаленняў узорам для пераймання.

Аўтар шырока карыстаецца вобразнай паэтыкай і сімволікай, што дапамагае стварыць адпаведны настрой у чытача, раскрыць псіхічны стан герояў. Прырода адухоўлена ў творы, яна суперажывае гераіні, спачувае яе гору. У казку ўведзены вусна-паэтычныя эпітаты (конь буланы, сінія вочы), параўнанні (дзяўчына як птушка), кароткія формы назоўнікаў (прасторамі вод, бясхмарная сінь). Для мовы народных песнь характэрны ўстойлівыя зрашчэнні. М.Танк выкарыстоўвае менавіта такія ўстойлівыя зрашчэнні слоў, якія ўспрымаюцца як адзінае семантычнае цэлае: шум-гоман, пявуння-жалейка, хмара-навала, папараць-кветка. Вобразны паралелізм пераканаўча пацвярджае, што такія зрашчэнні трэба разумець як адзінае цэлае, якое раскрывае выдатныя магчымасці беларускага фальклору.

Папулярнасць творчасці М.Танка тлумачыцца блізкасцю да народнай паэзіі. Таму многія яго вершы пакладзены на музыку (“Партызанскія акопы”, “Гаварыла зямля”, “Пасылае маці думы”, “Вясельная”, “Заручаны”, “Нарач”, “Дуб”, “Завушніцы”, “Казак гнаў каня”, “Добрай раніцы”, “Жаўрук” і інш.).

М.Танк заўсёды вельмі тонка адчувае хараство жыцця і прыроды. Паўната душэўных перажыванняў – неад’емная рыса яго паэзіі. Таму творца ўсё глыбей і глыбей асвойваў пласты народнай свядомасці, разумеючы, што іменна гэта з’яўляецца асновай высокіх маральных пачуццяў і першасным крытэрыем у асэнсаванні жыцця, чалавека і часу.

Спіс літаратуры:

1.Танк, М.Збор твораў./М.Танк.-Мінск :”Хрвест”, 2010.-1008 с.

2. Танк, М. Збор твораў : у 4-х т. / М.Танк. – Мінск : “Беларусь”, 1967. – Т. 4 : Перапіска з зямлёй. Лісткі каляндара. Шляхамі дружбы,- 700 с.